КАЛЯНДАРНА-ТЭМАТЫЧНАЕ ПЛАНАВАННЕ. БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА
11 КЛАС (базавы ўзровень)

(53 гадзіны на год, з іх на творчыя работы — 4 гадзіны)

Размеркаванневучэбнагаматэрыялупрыводзіцца ў адпаведнасцісазместам і структурайвучэбнагадапаможніка: Беларускаялітаратура: вучэб. дапам. для 11-га кл. агульнаадукац. устаноў з беларус. і рус.мовамінавучання / З.П.Мельнікава [і інш.]; падрэд. З.П.Мельнікавай, Г.М.Ішчанка. – Мінск: Нац. ін-т адукацыі, 2009.

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| Нумар урока і дата правя-дзення | Тэма ўрока | Коль-касць гадзін | Мэты вывучэння тэмы | Характарыстыка асноўных відаў і спосабаў дзейнасці | Дамашняе заданне |
| **Беларуская літаратура перыяду 1966- пачатку 1990 гадоў (32 гадзіны і 2 гадзіны на творчую работу; 1 гадзіна – на ўрок па творах для дадатковага чытання)** | | | | | |
| 1 | Развіццё беларускай літаратуры ў 1966-пач. 1990 г.г. | 1 | Даць агульную характарыстыку грамадска-культурнаму і літаратурнаму жыццю Беларусі ў 1966- п.1990г.г., акрэсліць тэматычную і жанрава-стылёвую разнастайнасць беларускай літаратуры гэтага перыяду. Забяспечыць развіццё уменняў вучняў вылучаць галоўнае ў аповедзе настаўніка, канспектаваць згодна з планам. Уплываць на фарміраванне пачуцця грамадзянскага абавязку, любові і павагі да роднай літаратуры | Складанне тэзіснага плана лекцыі настаўніка. Канспектаванне артыкула падручніка (с. 6-12). Вуснае выказванне «Здабыткі бнларускай паэзіі, прозы і драматургіі 1960х – 1990х гадоў» | С. 12, пытанні 4-8 |
| **Іван Шамякін (5 гадзін)** | | | | | |
| 2 | Кароткія звесткі аб жыцці і творчасці | 1 | Пазнаёміць вучняў з асноўнымі этапамі жыцця і творчасці Івана Шамякіна, абудзіць | Мультымедыйная прэзентацыя «Шляхамі Івана Шамякіна». | Вылучыць асноўныя |

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| | І.Шамякіна | | цікавасць да яго твораў. Развіваць уменні і навыкі самастойнай працы з крыніцамі інфармацыі, звязнае маўленне вучняў. Выхоўваць актыўную жыццёвую пазіцыю | Складанне апорнага канспекта артыкула падрусніка (с. 13-16). Асэнсаванне ўспамінаў і дзённікавых запісаў пісьменніка. Паведамленне вучня «Творчасць Івана Шамякіна XX – п. XXI стст.». Напісанне сінквейна з апорным словам «Шамякін». | сюжэтныя лініі рамана «Сэрца на далоні» |
| 3 | Раман І. Шамякіна «Сэрца на далоні»: тэматыка твора, асноўныя сюжэтныя лініі | 1 | Стварыць умовы для інтэлектуальнага і эмацыянальнага ўспрымання рамана І. Шамякіна «Сэрца на далоні», вызначыць тэматыку твора і асноўныя сюжэтныя лініі. Развіваць уменні вучняў аднаўляць мастацкія карціны, створаныя пісьменнікам, абгрунтоўваць сваю ацэнку прачытанага. Садзейнічаць выхаванню чытацкай культуры вучняў | Эўрыстычная гутарка па выяўленне першаснага ўражання ад твора. Выбарачны пераках эпізодаў твора. Аналіз сюжэтных ліній рамана | Падрыхтаваць цытатныя характарысты-кі герояў рамана |
| 4 | Вобразная сістэма рамана І. Шамякіна «Сэрца на далоні» | 1 | Даць характарыстыку вобразам Яраша, Шыковіча, Гукана, доктара Савіча, Зосі Савіч. Развіваць уменні вучняў характарызваць вобразы-персанажы і выяўляць аўтарскую пазіцыю, абгрунтоўваць уласную ацэнку герояў і падзей. Стварыць умовы для выхавання ў вучняў асноўных каштоўнасных арыентацый | Выбарачны пераказ твора. Характарыстыка вобразаў Яраша, Шыковіча, Гукана, доктара Савіча, Зосі Савіч. Назіранне за спосабамі раскрыцця ўнутранага свету герояў. Аргументаванне ўласнай ацэнкі герояў і падзей. Выяўленне аўтарскай пазіцыі ў творы | С. 48 пытанні 5,6. |
| 5 | Маладое пакаленне ў | 1 | Ахарактарызаваць вобразы маладога | Параўнальная характарыстыка | С.48 |

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| | рамана І. Шамякіна «Сэрца на далоні» | | пакалення і выявіць іх ролю ў раскрыцці аўтарскай пазіцыі. Развіваць уменні вучняў характарызваць вобразы-персанажы і выяўляць аўтарскую пазіцыю, абгрунтоўваць уласную ацэнку герояў і падзей. Садзейнічаць выхаванню ў вучняў актыўнай жыццёвай пазіцыі | вобразаў прадстаўнікоў маладога пакалення ў рамане (Славіка, Тараса і інш.). Назіранне за спосабамі раскрыцця ўнутранага свету герояў. Аргументаванне ўласнай ацэнкі герояў і падзей. Выяўленне аўтарскай пазіцыі ў творы | пытанне 7 |
| 6 | Маральна-этычная праблематыка раманаІ. Шамякіна «Сэрца на далоні» | 1 | Вызначыць асноўныя праблемы, што разглядаюцца ў творы, і асэнсаваць аўтарскую канцэпцыю чалавека і свету. Развіваць уменні аналізаваць твор з улікам яго ідэйна-мастацкай цэласнасці і аўтарскай пазіцыі, абгрунтоўваць сваю ацэнку прачытанага. Садзейнічаць выхаванню духоўна-маральнай культуры вучняў | Эўрыстычнае гутарка па асэнсаванні праблематыкі рамана. Раскрыццё сімвалічнага сэнсу назвы твора. Выяўленне аўтарскай пазіцыі ў творы. Аргументаванне ўласнай ацэнкі герояў і падзей. Вуснае выказванне «Актуальнасць твораў І.Шамякіна ў нашы дні» | Падрыхтоўка міні-праектаў па творчай біяграфіі В. Быкава |
| **Васіль Быкаў (7 гадзін і 2 гадзіны на творчую работу)** | | | | | |
| 7 | Кароткія звесткі аб жыцці і творчасці Васіля Быкава | 1 | Актуалізаваць і пашырыць веды вучняў пра жыццёвы і творчы шляхВ.Быкава, адметнасць яго аўтарскага стылю. Садзейнічаць развіццю ў вучняў уменняў самастойнай працы з навукова-папулярнымі крыніцамі інфармацыі, камунікатыўных навыкаў. Зацікавіць вучняў неардынарнай асобай празаіка і яго шматграннай творчай дзейнасцю, паспрыяць выхаванню пачуцця нацыянальнай самасвядомасці | Прэзентацыя вучнёўскіх праектаў: «Жыццяпіс Васіля Быкава», «Ваенная тэма ў творчасці Васіля Быкава», «Адметнасць быкаўскай аповесці», «Творы Васіля Быкава на экране» | Падрыхтаваць цытатныя характарысты кі герояў аповесці «Сотнікаў» |

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| 8 | Вобразная сістэма аповесці В. Быкава «Сотнікаў» | 1 | Прааналізаваць вобразы Сотнікава і Рыбака, а таксама персанажаў другога плана ў аповесці. Развіваць уменні вучняў характарызваць вобразы-персанажы і выяўляць аўтарскую пазіцыю, абгрунтоўваць уласную ацэнку герояў і падзей.Садзейнічаць выхаванню духоўнасці вучняў праз асэнсаванне ўяўных і сапраўдных каштоўнасцей жыцця. | Выбарачны пераказ зместу аповесці. Характарыстыка вобразаў Сотнікава і Рыбака, персанажаў другога плана (стараста, Дзёмчыха, Бася). Выяўленне аўтарскай пазіцыі і сваіх адносін да герояў | С.69 пытанне 1 |
| 9 | Праблема маральнага выбару ў аповесці В. Быкава «Сотнікаў» | 1 | Праз асэнсаванне асаблівасцей сюжэта, кампазіцыі і праблематыкі аповесці падвесці вучняў да разумення філасофскага зместу твора. Развіваць уменні аналізаваць твор з улікам яго ідэйна-мастацкай цэласнасці і аўтарскай пазіцыі. Садзейнічаць станаўленню светапогляду вучняў праз усведамленне быкаўскай ісціны:«Ад кожнага залежыць усё!» | Ідэйна-мастацкі аналіз твора ў адзінстве зместу і формы. Аргументаванне ўласнай ацэнкі герояў і падзей. Супастаўленне твора з яго экранізацыяй. Праблемная гутарка, накіраваная на асэнсаванне праблематыкі твора і выўленне аўтарскай канцэпцыі чалавека і свету. | Выбарачны пераказ аповесці«Знак бяды» |